ективными условиями развития той или иной страны, а также мира в целом.

УДК 947.6

П. В. Дзядзюля, дацэнт

## ДЗЕЙНАСЦЬ УРАДА БНР ПА ФАРМІРАВАННІ СІСТЭМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ І КУЛЬТУРЫ

Setling up the problem of the Belarussian language, literature, publishing at the end of XIX—in the beginning of XX century. That wish of the Belarussian Popular Front to make cultural basis under unfavourable conditions.

Пасля стагоддзяў забыцця беларускае друкаванае слова як фактар нацыянальнай культуры усё часцей з'яуляецца ў XIX ст., але значна паскорыла літаратурна-грамадскі рух на Беларусі і зняла многія абмежаванні рэвалюцыя 1905-1907 гг. З гэтага часу пачалі арганізоўвацца легальныя органы друку і беларускія выдавецтвы. Беларуская мова яшчэ не стала мовай адукацыі, афіцыйнай культуры. На Беларусі панавалі руская і польская культуры, адпаведна пашыраліся мовы блізкіх беларусам славянскіх народаў, інтэлектуальная эліта якіх не ўспрымала мясцовага «дыялекту», а народная культура існавала толькі як мясцовая экзотыка.

Імкненне дамагчыся прызнання беларусаў з іх своеасаблівай мовай, культурай, раўнапраўнымі сярод іншых народаў, было жаданай марай многіх пакаленняў беларускіх інтэлектуалаў. Але і рускія, і польскія шавіністы цягнулі кожны да сябе тутэйшых, заманьваючы найбольш здольных з іх адукацыяй і магчымасцю выйсці з галечы, забыцця. Многія, атрымаўшы адпаведную адукацыю, вярталіся да свайго народа і самаахвярна працавалі дзеля яго карысці. К.Каліноўскі, Ф.Багушэвіч, У.Самойла, браты І. і А.Луцкевічы, А.Уласаў і ўсе тыя, хто пачынаў беларускі друк, літаратуру, нацыянальны тэатр, стваралі палітычныя і грамадскія арганізацыі, рыхтавалі фундамент беларускай дзяржаўнасці.

Усе яны разам і кожны паасобку мелі дасканалую інтэлектуальную падрыхтоўку і разуменне таго, што кожны народ мае права жыць у сваей дзяржаве, а яна, у сваю чаргу, павінна дбаць аб сваім духоўным грунце—нацыянальнай адукацыі і культуры.

Культуру немагчыма зразумець асобна ад мовы—адзінага ў сваім родзе, найбольш важнага элемента яе структуры. Менавіта мова

дазваляе афармляць культурную дзейнасць і дапамагае фарміраваць наша ўспрыманне свету (М.Говард. Сучасная культурная антрапалогія.- Мн.: Тэхналогія, 1995. - С. 83, 85).

Ва ўсіх праграмах першай нацыянальнай палітычнай партыі Беларускай сацыялістычнай грамады змяшчаліся патрабаванні свабоды слова, друку, абавязковай бясплатнай народнай асветы з правам вучыцца на сваёй роднай мове. Пад кіраўніцтвам БСГ газета «Наша ніва» стала галоўнай трыбунай, ідэолагам і арганізатарам беларускага нацыянальнага руху, дамагалася прызнання факта існавання самастойнай беларускай нацыі, змагалася за яе раўнапраўе з іншымі народамі, за ўвядзенне беларускай мовы ў школе, царкве і касцёле (ЭГБ. - Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993. - Т.1. - С. 411).

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. палітычная і культурная эліта Беларусі патрабавала аўтаноміі Беларусі ў складзе федэратыўнай Расійскай дэмакратычнай рэспублікі, асуджала нежаданне Часовага ўрада ажыццявіць лозунг самавызначэння народаў. Напярэдадні і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі незалежніцкія тэндэнцыі сярод беларускіх дзеячаў узмацніліся. Паслярэвалюцыйная анархія на тэрыторыі былой Расійскай імперыі, імперыялістычная вайна, падпісанне і ратыфікацыя Савецкай Расіяй Брэсцкага міру з Германіяй падштурхнулі беларусаў аб'явіць 9 сакавіка 1918 г. Беларускую Народную Рэспубліку, а 25 сакавіка 1918 г. абвясціць яе незалежнай і свабоднай дзяржавай.

Ва ўмовах нямецкай акупацыі ўраду БНР не ўдалося стварыць адпаведныя палітычныя і эканамічныя структуры. Тым больш што Германія, згодна з Брэсцкім мірам, абяцала Расіі не дапускаць на акупіраваных ёю тэрыторыях сепаратысцкіх памкненняў. І толькі пасля таго, як у чэрвені 1918 г. урад БНР аб'явіў нядзейнымі на тэрыторыі рэспублікі дэкрэты і пастановы ўрада РСФСР, акупацыйныя ўлады перадалі ў кампетэнцыю Народнага Сакратарыята гандаль, прамысловасць, сацыяльную апеку, асвету і культуру (ЭГБ. - Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993. - Т.1. - С. 385).

Найбольшых поспехаў БНР дасягнула ў развіцці адукацыі і культуры. Адным з першых дакументаў Народнага Сакратарыята была пастанова аб дзяржаўным статусе беларускай мовы. БНР не шкадавала часу і сродкаў на развіццё беларускага школьніцтва. Сетка навучальных установаў пашыралася і на тэрыторыю, якую немцы акупіравалі пасля зрыву Брэсцкіх перагавораў у лютым 1918 г. Да кіраўніцтва адукацыяй былі запрошаны вядомыя ў той час вучоныя. Прафесар

Я.Карскі апекаваў сярэднія школы, доктар В.Іваноўскі—прафесійныя школы, а кандыдат філалогіі Пецярбургскага універсітэта Б.Тарашкевіч—народныя пачатковыя школы. Пры Народным Сакратарыяце працавалі бюро распрацоўкі школьных падручнікаў і таварыства «Прасвета», што займалася іх выданнем. 1 красавіка 1918 г. былі арганізаваны курсы беларусазнаўства, на якіх лекцыі чыталі А.Смоліч (геаграфія), Я.Варонка (гісторыя), Т.Грыб (літаратура), прафесар І.Масоніюс і Я.Лёсік (мова). З 1 верасня працавалі настаўніцкія курсы, а праз месяц быў заснаваны «Беларускі настаўніцкі саюз», якім кіраваў С.Рак-Міхайлоўскі (Культурна-асветніцкая дзейнасць урада БНР //Голас Радзімы. - 1994. - № 48).

Паводле розных падлікаў, у гэты час на Беларусі працавалі ад 150 да 350 беларускіх школ, у тым ліку Будслаўская беларуская гімназія, а таксама гімназіі ў Мінску, Навагрудку, Слуцку і Гродне. Падрыхтоўка настаўнікаў, апрача Свіслацкай семінарыі, вялася ў Мінскім педагагічным інстытуце, дзе выкладалі В.Іваноўскі, У.Ігнатоўскі, Б.Тарашкевіч, Я.Карскі і іншыя (ЭГБ. - Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993. - Т.1. - С.385).

Яшчэ задоўга да ўзнікнення БНР беларуская інтэлігенцыя марыла аб адкрыцці нацыянальнага універсітэта. У розны час і пры розных абставінах пра універсітэт узгадвалі З.Жылуновіч, М.Доўнар-Запольскі, М.Янчук, Я.Карскі і іншыя. З восені 1917 г. ідэі ўтварэння Беларускага універсітэта і незалежнасці Беларусі становяцца непарыўнымі. На Усебеларускім з'ездзе пытанне пра універсітэт не раз уздымалася яго дэлегатамі. Калі браў слова Я.Карскі, то многія дэлегаты дружна сустракалі яго выкрыкамі: «Шчыра вітаем прафесара Беларускага універсітэта!». Секцыя народнай асветы з'езда выказалася за неадкладнае адкрыццё на Беларусі універсітэта. У красавіку 1918 г. Народны Сакратарыят БНР даручыў М.Доўнар-Запольскаму і Я.Карскаму скласці праект арганізацыі універсітэта, што яны ў хуткім часе і зрабілі. Яшчэ адзін праект быў прадстаўлены земскай губернскай управай, якая, акрамя таго, выдзеліла на гэтыя мэты 20000 рублёў. У маі таго ж года М.Доўнар-Запольскі паведаміў ураду БНР, што ён атрымаў згоду 36 вядомых навукоўцаў (у асноўным выхадцаў з Беларусі) на займанне прафесарскіх пасадаў у Беларускім універсітэце. Вось толькі некаторыя з іх: У.Завітневіч, П.Жуковіч, Б.Эпімах-Шыпіла, І.Лапа, М.Янчук. 6 чэрвеня 1918 г. у памяшканні ўрада прайшла нарада, на якой абмяркоўваліся арганізацыйныя пытанні па стварэнні ў

Мінску універсітэта (Беларускі універсітэт: з гісторыі стварэння //Спадчына. - 1994. - № 4. - С. 61-62).

Урад БНР арганізаваў збор ахвяраванняў на развіццё асветы. Яны паступалі ад ксяндзоў, княгіні М.Радзівіл, Э.Вайніловіча і іншых (Культурна-асветніцкая дзейнасць урада БНР //Голас Радзімы. - 1994. - № 48).

Беларускія арганізацыі, што існавалі ў 1918 г. на тэрыторыі Савецкай Расіі, неаднаразова звярталіся да бальшавіцкага кіраўніцтва па пытанні стварэння беларускай вышэйшай навуковай установы. Так, Беларускі абласны камітэт прасіў аб пераводзе Нова-Аляксандраўскага інстытута ў Горы-Горкі, а Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам) дамагаўся замацавання за Беларуссю эвакуіраванага Юр'еўскага універсітэта. Аднак гэтыя праекты не былі рэалізаваныя. Савецкі ўрад не выяўляў асаблівай зацікаўленасці ўкладваць сродкі ў эканамічнае і культурнае развіццё «спрэчнай тэрыторыі», на якую прэтэндаваў новы імперыяліст—Польшча. (Беларускі універсітэт: з гісторыі стварэння //Спадчына. - 1994. - № 4. - С. 62).

Беларускія ўлады добра разумелі ролю друкаванага слова на роднай мове. За няпоўны 1918 г. у БНР на беларускай мове выходзілі 6 газет і 3 часопісы, працавалі 11 выдавецтваў, якія за кароткі час выпусцілі 35 беларускіх кніг.

Выклікае захапленне энтузіязм нацыянальнай эліты ў жаданні разгарнуць шырокую культурную дзейнасць на роднай зямлі. 19 мая 1918 г. у Мінску пачынае працу Беларускі народны дом імя М.Багдановіча, у гэты ж дзень на базе Таварыства драмы і камедыі адкрыўся Беларускі дзяржаўны тэатр. Са жніўня культурна-асветніцкай дзейнасцю займаліся гурткі «Бацькаўшчына», Мінскае таварыства навукі, літаратуры і мастацтва. На базе створанага ў 1917 г. гуртка беларускай моладзі «Вянок» узнікла Беларуская вучнёўская грамада. Секцыі гэтых арганізацый працавалі ў Мінску, Вільні, Гродне, павятовых цэнтрах, у гімназіях і школах. Культурна-асветныя арганізацыі стваралі самадзейныя драматычныя і харавыя гурткі, ладзілі беларускія спектаклі і канцэрты для жыхароў гарадоў, мястэчак і вёсак. Беларускія культурна-асветныя арганізацыі працавалі таксама на Украіне і ў Латвіі. У 1918 г. у якасці дзяржаўных былі ўзаконены бела-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня» (ЭГБ. - Мн.: Беларуская Энцыклапедыя, 1993. - Т.1. - С. 386).

Па ініцыятыве і пры дапамозе Івана Луцкевіча нямецкім мастацтвазнаўцам Іпелем у 1918 г. былі арганізаваны дзве выставы бела-

рускага мастацтва—у Мінску і Вільні. Да іх адкрыцця Луцкевіч і Іпель падрыхтавалі два каталогі з грунтоўным аналізам экспанатаў. Усебаковае даследаванне лепшых узораў прафесійнага і народнага мастацтва дазволіла Іпелю надрукаваць некалькі артыкулаў у еўрапейскіх выданнях, дзе ён упершыню ўжывае паняцці «беларускае мастацтва», «беларуская школа малявання». Аўтар, у прыватнасці, высока ацэньвае як унікальныя тры найвыдатнейшыя царквы XV ст. у Слуцку. Адна з іх—Юраўская—захоўвала стары іканастас, разны, распісаны мясцовымі майстрамі, выдзялялася прыемнай гармоніяй і з'яўлялася красою ўсіх беларускіх цэркваў.

Іпель адзначае багацце мастацкіх твораў у Магілёўскім храме-музеі, якія маюць нязначны ўплыў візантыйска-расійскай школы. Шмат іншых цікавых назіранняў можна знайсці ў артыкулах нямецкага аўтара (Іпель А. Беларускае мастацтва //Спадчына. - 1996. - № 3. - С. 274-288).

Аб імкненні ўрада БНР пашырыць культурную работу сведчыць факт выдання паштовых марак з выявамі Ф.Скарыны, герба «Пагоня», беларускіх тыпаў (Цітоў А. Сімволіка і аўтары марак БНР //Спадчына. - 1990. - № 4. - С. 71).

Праяўляўся клопат і пра тых беларусаў, якія апынуліся ў нямецкім палоне ў час першай сусветнай вайны. Праз начальніка Беларускай ваеннай місіі ў Берліне па справах палонных быў устаноўлены кантакт са многімі лагерамі, дзе знаходзіліся і беларусы. Ім аказвалася пасільная матэрыяльная дапамога, распаўсюджвалася літаратура, газеты на беларускай мове, працавалі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці, беларуская школа, бібліятэка, хор (Дакументы дыпламатычнай дзейнасці БНР у Германіі //Спадчына. - 1998. - № 2. - С.220-226).

Многае з напрацаванага ў часы БНР стала асновай культурнага адраджэння ў пачатку 20-х гадоў. Найперш выклікае павагу самаахвярнасць і членаў урада БНР, і нешматлікай беларускай інтэлігенцыі, якія за кароткі час ва ўмовах акупацыі зрабілі шмат, каб абудзіць беларуса ад летаргічнага сну, даць яму надзею на лепшае, годнае жыццё.